# **Студэнцкі праект «Наследнікі пераможцаў: гісторыя маёй сям'і»**

Развіццё прафесійных кампетэнцый у будучых журналістаў

**Ю. М. Лук'янюк,**
загадчык кафедры тэхналогій камунікацыі і сувязей з грамадскасцю
факультэта журналістыкі БДУ, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**У артыкуле прадстаўлена апісанне праекта «Наследнікі пераможцаў: гісторыя маёй сям'і», работа над якім арганізуецца ў дыстанцыйнай форме на базе адукацыйнага партала факультэта журналістыкі. Таксама выкарыстоўваюцца магчымасці сацыяльных сетак.**

**Праект мае грамадзянска-патрыятычную накіраванасць. Яго асноўная мэта – развіццё ў будучых журналістаў сістэмы духоўна-маральных каштоўнасцей, фарміраванне гатоўнасці несці асабістую адказнасць за лёс сваёй краіны.**

Праект выконваецца студэнтамі 4 курса спецыяльнасці «Інфармацыя і камунікацыі» пры падрыхтоўцы да заняткаў па дысцыпліне «Навуковая журналістыка», у рамках якой разглядаецца тэма «Знакамітыя беларускія журналісты – ветэраны Вялікай Айчыннай вайны». Падчас перакрыжаванага абмеркавання на форуме вынікаў работы студэнты аналізуюць створаны кантэнт (відэа-, фотаматэрыялы і тэксты), рэцэнзуюць атрыманыя адукацыйныя прадукты. Заняткі пабудаваны на аснове эўрыстычнага метаду, што дазваляе актывізаваць творчыя і інтэлектуальныя здольнасці маладых людзей, стварыць умовы для развіцця навыкаў рэфлексіі, камунікатыўных навыкаў.

**Асноўныя задачы педагога:**

❒ актуалізаваць веды студэнтаў аб культурна-гістарычнай спадчыне краіны;

❒ стварыць умовы для самастойнай распрацоўкі студэнтамі адукацыйнага прадукта (нарыс-эсэ) на аснове вывучэння кола рэальных аб’ектаў рэчаіснасці;

❒ забяспечыць развіццё камунікатыўных уменняў, крэатыўнага мыслення;

❒ садзейнічаць станаўленню грамадзянскай пазіцыі.

**Пастаноўка мэты студэнтам**

Студэнтам прапануецца вызначыць вынік сваёй дзейнасці і прадставіць фармулёўку ў групе (спасылка на групу ў сацыяльных сетках: https://vk.com/public194637552).

**Галоўная ідэя заняткаў з пазіцыі самарэалізацыі студэнта:** развіццё навыкаў стварэння тэксту ў адпаведнасці з яго жанравымі асаблівасцямі на аснове самастойна прааналізаванага фактычнага матэрыялу.

**Кола рэальных аб’ектаў рэчаіснасці, прапанаваных для вывучэння:** рэальныя падзеі ваенных гадоў, перажытыя членамі сям’і.

**Метады вывучэння рэальнага аб’екта рэчаіснасці:** метад эмпатыі, эўрыстычнае назіранне, рэфлексія.

**Ход заняткаў**

**I. Пастаноўка праблемы**

Адкрытае заданне для вывучэння рэальнага аб’екта рэчаіснасці. У Беларусі няма такой сям’і, якую б не закранула Вялікая Айчынная вайна. Уявіце сябе на месцы свайго прадзеда ці прабабулі, якія перажылі падзеі ваенных гадоў. Апішыце іх успаміны, адрасаваныя будучым пакаленням, у выглядзе нарыса-эсэ. Апавяданне павінна быць ад першай асобы.

**II. Дэманстрацыя і параўнанне атрыманых адукацыйных прадуктаў**

Адукацыйныя прадукты (праекты) размяшчаюцца для абмеркавання, галасавання і рэцэнзавання на адукацыйным партале БДУ і ў сацсетках «Вконтакте» і «TikTok». Студэнты параўноўваюць уласныя прадукты з працамі аднагрупнікаў, аналізуюць найбольш і найменш удалыя фрагменты тэкстаў і прэзентацый, якія іх суправаджаюць. Затым адбываецца знаёмства з іншымі

варыянтамі выканання праекта (відэафільм пра прафесара Р. Булацкага, прэзентацыя і дакументальны фільм пра прафесара М. Цікоцкага і інш.). Каментарыі студэнтаў да прац сакурснікаў, заўвагі і адзнакі выкладчыка адлюстроўваюцца на форуме.

На занятках прадугледжваецца выкананне анлайн-тэста (правяраецца веданне біяграфій беларускіх журналістаў – удзельнікаў вайны). З мэтай абагульнення тэмы студэнтам прапануецца адкрытае заданне: неабходна зняць кароткі (60 секунд) відэаролік «Свечка памяці. Хвіліна маўчання», у якім павінна быць адлюстравана Вялікая Айчынная вайна як найважнейшая для беларуса падзея. Заданне выконваецца ў падгрупах. Пасля аналізу лепшыя 5 ролікаў размяшчаюцца ў сацсетцы «TikTok» (выбіраюцца шляхам галасавання студэнтаў на партале).

Для ўзаемадзеяння са студэнтамі былі выкарыстаныя наступныя модулі платформы Moodle:

1) гласарый, які дазваляе ствараць і падтрымліваць спіс азначэнняў ці ствараць і сістэматызаваць рэсурсы і інфармацыю;

2) форум, які дазваляе камунікаваць у асінхронным рэжыме на працягу доўгага часу;

3) чат, які дазваляе мець зносіны ў рэальным часе;

4) база даных, якая дазваляе ствараць, абслугоўваць і шукаць свае запісы з іх сукупнасці.

***Ацэньванне адукацыйных вынікаў.***

Пры ацэньванні творчых работ студэнтаў выкладчык выкарыстоўвае такія вучэбныя элементы адукацыйнай сістэмы Moodle, як «Апытанне», «Форум», «Тэст», «Анкетаванне».

***Крытэрыі ацэньвання:***

- ✓ улік жанравых асаблівасцей тэксту;
- ✓ наяўнасць даследчых пытанняў;
- ✓ наяўнасць і аргументаванасць высноў;

✓ пісьменнасць выкладу (выкананне граматычных, арфаграфічных, пунктуацыйных норм);

✓ арыгінальнасць, крэатыўнасць, эмацыянальнасць падачы матэрыялу.

**III. Рэфлексія**

Выкладчык прапануе правесці рэфлексію настрою і эмацыянальнага стану. Для гэтага студэнт павінны напісаць невялікія тэксты з адказамі на пытанні: 1. Якія былі вашыя першапачатковыя мэты і ці дасягнулі вы іх? 2. Які галоўны вынік вы атрымалі? 3. Што не атрымалася і чаму? 4. Пра што яшчэ хацелася б даведацца?

## Літаратура


1. **Король, А. Д.** Диалоговый подход к организации эвристического обучения / А. Д. Король // Педагогика. – 2007. – № 9. – С. 18–25.
2. **Сластенин, В. А.** Рефлексивная культура и профессионализм учителя / В. А. Сластенин // Педагогическое образование и наука. – 2005. – № 3. – С. 37–40.